**А. В. ДОЎГАЛЬ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

# ПРАЦА З ТЭКСТАМ: вучэбна-трэніровачныя заданні

**Прапанаваны тэкст і заданні да яго будуць карысныя ў якасці дыдактычнага матэрыялу для падрыхтоўкі да алімпіяды, а таксама з мэтай павышэння ўзроўню ведаў па беларускай мове, іх кантролю і самакантролю. Заданні распрацаваны па тэксце і ахопліваюць усе ўзроўні беларускай мовы — ад фанетыкі да сінтаксісу. Сам тэкст складзены аўтарам паводле разнастайных публікацый, прысвечаных Міжнароднаму дню роднай мовы і размешчаных у глабальнай сетцы інтэрнэт. Гэты вучэбна-трэніровачны комплекс прайшоў апрабацыю ў шматпрадметнай завочнай школе па беларускай мове, якая дзейнічае на базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Абласны цэнтр творчасці» г. Магілёва.**

## Міжнародны (Д, д)зень роднай мовы

(1) 21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца (М, м)іжнародны (Д, д)зень роднай мовы. (2) Гэта свята было абвешчана **ЮНЕСКА** па ініцы..тыве краіны Бангладэш і праводзіцца (што) год з 2000 года. (3) Гісторыя свята сумная 21 лютага 1952 года ў горадзе Дака сталіцы Бангладэш загінулі пяць студэнтаў якія адстойвалі права прызнаць родную для іх бенгальскую мову дз..ржаўнай. (4) Мэта свята захаванне лінгвістычнай разнастайнасці і шматмоў..я ў сучасным свеце падтрыманне нацы..нальных моў і культур забеспячэнне права **кожнага** грамадзяніна карыстацца роднай мовай.

(5) Сёння на лінгвістычнай карце налічваецца **каля** 6 тыс..ч моў але палова з іх **паводле** ацэнкі ЮНЕСКА знаходзіцца пад пагрозай знікнення а больш за 200 лічацца мёртвымі. (6) **Тыс..чы** моў не выкарыстоўваюцца ў сістэме адукацыі і не пра..ставулены ў інтэрн..це. (7) Кожныя 2 тыдн.. ў свеце знікае 1 мова, і гэты лёс, як лічаць дасле..чыкі, **можа** напаткаць **палову** моў свету да канца XXI стаго..я. (8) ЮНЕСКА мае намер стварыць сістэму а..сочвання стану моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, і садзейнічаць выпраўленню становішча. (9) На 40 **найбольш** распаўсюджаных мовах сёння размаўляюць каля 2/3 насел..ніцтва Зямлі, а 96 % моў свету карыстаюцца толькі 3 % людзей. (10) У **дз..сятку** самых ужывальных па **колькасці** нос..бітаў сёння ўваходзяць наступныя мовы кітайская іспанская англійская **хіндзі** арабская бенгальская партугальская руская японская лахнда.

(11) Спецыялісты адзначаюць: раней мова знікала натуральным шляхам, **у выніку** гібелі народа (праз эпідэміі, войны), а сёння нос..біты д..браахвотна пераходзяць на **іншую** мову. (12) Асноўнай прычынай знікнення моў у сучасным свеце вучоныя называюць глабалізацыю і міграцыю. (13) Эканамічныя працэсы вымушаюць людзей пакідаць родныя м..сціны, шукаць працу ў вялікіх гарадах, іншых краінах, **дзе** яны адмаўляюцца ад роднай мовы і пачынаюць карыстацца іншымі, больш папулярнымі і пашыранымі.

(14) Міжнародны (Д, д)зень роднай мовы — **адна** з нагод падумаць пра лёс роднай мовы. (15) У гэты дзень усе мовы прызнаюцца роўнымі, бо кожная з іх з..яўляецца ўнікальнай спа..чынай, якую мы **павінны** захаваць для на..чадкаў. (16) Гісторыя ведае шматлікія прыклады таго, **як** са знікненнем мовы знікае этнас, нацыя. (17) Родная мова не патрабуе шмат ад сваіх нос..бітаў, яе **трэба проста** любіць і паважаць, берагчы як нацы..нальную каштоўнасць. (18) Мы часам саромеемся гаварыць (па) беларуску, называем тыс..чы прычын-перашкод для гэтага. (19) А між тым толькі родная мова **здольная** паказаць усяму свету нашу самабытнасць, адметнасць, індывідуальнасць. (20) Яна своеасаблівы культурны код, люстэрка грамадска (палітычнага) развіцця нашага народа, яго мыслення і псіхікі. (21) Яна не знікне, калі будзе крынічыць лю..ское жаданне размаўляць на ёй. (22) Гаварыць (па) беларуску — значыць пазнаваць, прызнаваць і паважаць сябе як нацыю. (23) Не будзем забывацца на словы Францішка Багушэвіча Яно добра а **нават** і трэба знаць сусе..скую мову **але** найперш трэба знаць сваю.

## Заданні да тэксту

**1.** Вызначце стыль тэксту:

☐ навуковы; ☐ публіцыстычны;
☐ афіцыйны; ☐ мастацкі.

**Арфаграфічныя і пунктуацыйныя заданні:**

**2.** Устаўце прапушчаныя літары і раскрыйце дужкі.

**3.** Расстаўце знакі прыпынку ў сказах пад нумарамі 3, 4, 5, 10 і 23.

**Фанетычныя заданні:**

**4.** Запішыце ў транскрыпцыі, як вымаўляюцца прыназоўнікі ў наступных спалучэннях слоў:

| | |
|---|---|
| праз эпідэміі | [ ] |
| з іх | [ ] |
| пад пагрозай | [ ] |
| ад роднай | [ ] |
| ад сваіх | [ ] |
| між тым | [ ] |

**5.** Праілюструйце наступныя фанетычныя з'явы беларускай мовы словамі з тэксту:

1) аглушэнне звонкіх на канцы слова;
2) асіміляцыя па мяккасці (прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх у сярэдзіне слова);
3) асіміляцыя па звонкасці (прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх у сярэдзіне слова);
4) асіміляцыя па глухасці (прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх у сярэдзіне слова);
5) поўная асіміляцыя (прыпадабненне аднаго зычнага да другога па ўсіх прыметах).

**Лексічныя заданні:**

**6.** Падбярыце рускія адпаведнікі да слоў з тэксту: *(што) год, лёс, нагода, спадчына, каштоўнасць, люстэрка.*

**7.** Пазнайце словы з тэксту па іх лексічных значэннях:

1) людзі будучых пакаленняў ( ______________ );
2) сацыяльная група людзей, народ ( __________ );
3) той, хто валодае, надзелены чым-небудзь (_____ ____________ );
4) арыгінальнасць, непадобнасць да іншых (______ ______________ );
5) працэс адлюстравання рэчаіснасці ў свядомасці чалавека ( ___________________ );

**8.** Скарыстаўшы тлумачальны слоўнік, дайце азначэнні паняццяў «глабалізацыя» і «міграцыя» (сказ 12).

**9.** Растлумачце значэнне дзеяслова «крынічыць» (сказ 21).

**Заданні па марфеміцы і словаўтварэнні:**

**10.** Выпішыце з другога абзаца дзеепрыметнікі і зрабіце іх марфемны разбор (па саставе).

**11.** Зрабіце словаўтваральны разбор слоў: *міжнародны, шматмоў..е, выпраўленне, нос..біт, размаўляць.*

**Фразеалагічныя заданні:**

**12.** Аднавіце прапушчаныя кампаненты фразеалагізмаў паводле сфармуляваных значэнняў.

| Фразеалагізм | Значэнне | Прапушчаны кампанент |
|---|---|---|
| ... мова | 'поўнае ўзаемаразуменне, поўная дамоўленасць' | |
| ... мова | 'іншасказальнае, алегарычнае выказванне думак' | |
| на ... мовах | 'не разумеючы адзін аднаго, па-рознаму адносячыся да прадмета размовы' | |
| ... мовы | 'здольнасць гаварыць' | |

**13.** Дайце лінгвістычнае азначэнне выказванню Францішка Багушэвіча:

☐ прыказка; ☐ перыфраза;
☐ прымаўка; ☐ крылатае слова;
☐ фразеалагізм; ☐ афарызм.

**Марфалагічныя заданні:**

**14.** Вызначце часцінамоўную прыналежнасць вылучаных у тэксце тлустым шрыфтам слоў.

**15.** Запоўніце табліцы, паставіўшы назоўнікі з тэксту ў патрэбнай склонавай форме.

1)

| Назоўнік | Р. скл. | М. скл. |
|---|---|---|
| намер | | |
| становішча | | |
| нос..біт | | |
| люстэрка | | |
| жаданне | | |

2)

| Назоўнік | Д. скл. |
|---|---|
| сталіца | |
| ацэнка | |
| мэта | |
| нацыя | |
| нагода | |

**16.** Вызначце разрады прыметнікаў у наступных словазлучэннях: *родная мова, нацыянальная мова, мёртвая мова, ужывальная мова, сусе..ская мова.*

**17.** Вызначце спражэнне і праспрагайце дзеясловы. Выдзеліце канчаткі.

| Дзеяслоў | Спражэнне | Адз. лік | Мн. лік |
|---|---|---|---|
| берагчы | | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. |
| паказаць | | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. |
| пазнаваць | | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. | 1-я ас.<br>2-я ас.<br>3-я ас. |

**18.** Вызначце канчаткі і постфіксы ў падкрэсленых дзеясловах.

**19.** З пазначаных сказаў выпішыце займеннікі і вызначце іх лексіка-граматычныя разрады.

| № сказа | Займеннікі | Лексіка-граматычныя разрады займеннікаў |
|---|---|---|
| 3 | | |
| 15 | | |
| 17 | | |
| 18 | | |
| 22 | | |

**20.** Запішыце ніжэйпрыведзеныя выразы з тэксту, замяніўшы лічбы словамі, і вызначце разрад лічэбнікаў па значэнні.

| Спалучэнне | Слоўны запіс | Разрад лічэбніка |
|---|---|---|
| з 2000 года | | |
| каля 6 тыс..ч моў | | |
| да канца XXI стаго..я | | |
| прыкладна 2/3 насельніцтва | | |
| а 96 % моў свету карыстаюцца | | |

**Сінтаксічныя заданні:**

**21.** Запоўніце табліцу прыкладамі з першага абзаца тэксту.

| Словазлучэнне | Галоўнае слова | Залежнае слова | Від сувязі |
|---|---|---|---|
| ва ўсім свеце | | | |
| | | свята | кіраванне |
| | праводзіцца | | прымыканне |
| | права | | |
| у горадзе Дака | | | |
| | захаванне | | кіраванне |
| | | студэнтаў | кіраванне |
| родную для іх | | | |
| | лютага | | дапасаванне |

**22.** Ацаніце правільнасць сцвярджэння, выберыце ТАК ці НЕ.

| Сцвярджэнне | Варыянт адказу |
|---|---|
| 1) сказ № 1 з'яўляецца простым аднасастаўным | так / не |
| 2) сказ № 3 з'яўляецца складаным бяззлучнікавым | так / не |
| 3) сказ № 7 з'яўляецца складаназлучаным | так / не |
| 4) сказ № 8 з'яўляецца складаназалежным | так / не |
| 5) сказ № 13 з'яўляецца складаным сказам з рознымі відамі сувязі | так / не |
| 6) сказ № 18 з'яўляецца простым двухсастаўным | так / не |

**23.** Выпішыце з указаных сказаў граматычныя асновы, вызначце тыпы выказнікаў.

| № сказа | Дзейнік / дзейнікі | Выказнік / выказнікі | Тып выказніка |
|---|---|---|---|
| 2 | | | |
| 4 | | | |
| 6 | | | |
| 12 | | | |

**24.** Ацаніце правільнасць сцвярджэння, выберыце ТАК ці НЕ.

| Сцвярджэнне | Варыянт адказу |
|---|---|
| 1) у сказе № 2 ёсць аднародныя акалічнасці | так / не |
| 2) у сказе № 4 ёсць аднародныя дапаўненні | так / не |
| 3) у сказе № 6 дзейнік выражаны непадзельным словазлучэннем | так / не |
| 4) у сказе № 10 ёсць аднародныя азначэнні | так / не |
| 5) у сказе № 22 ёсць аднародныя выказнікі | так / не |

**25.** Разбярыце сказы № 14 і 18 па членах сказа.

**26.** Знайдзіце ў другім абзацы складаназлучаныя сказы і вызначце сэнсавыя адносіны паміж граматычнымі часткамі.

| № сказа | Колькасць граматычных частак | Сэнсавыя адносіны |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |

**27.** Ахарактарызуйце складаназалежныя сказы.

| № сказа | Тып дададай часткі | Сродак сувязі паміж часткамі (запішыце яго і вызначце, злучнік ці злучальнае слова) |
|---|---|---|
| 8 | | |
| 13 | | |
| 16 | | |
| 21 | | |

**28.** Падкрэсліце граматычныя асновы ў сказе № 15. Пабудуйце яго схему, вызначце тып падпарадкавання.

**29.** Выканайце заданні па сказе № 17. Выберыце ТАК ці НЕ.

| Сцвярджэнне | Варыянт адказу |
|---|---|
| 1) гэта складаны бяззлучнікавы сказ | так / не |
| 2) у сказе тры граматычныя часткі | так / не |
| 3) у першай частцы дзейнік выражаны сінтаксічна непадзельным словазлучэннем | так / не |
| 4) у першай частцы слова *шмат* з'яўляецца акалічнасцю | так / не |
| 5) у другой частцы тры аднародныя састаўныя дзеяслоўныя выказнікі | так / не |
| 6) у другой частцы слова *проста* не з'яўляецца членам сказа | так / не |
| 7) трэцяя граматычная частка сказа пачынаецца са слова *берагчы* | так / не |

**30.** Пабудуйце схему сказа № 11, вылучыўшы логіка-структурны блок. Дапішыце патрэбную інфармацыю пра гэты сказ.

У гэтым сказе ___________ граматычныя часткі. Логіка-структурны блок утвараюць часткі _________ і _________ . Граматычныя часткі блока звязаны паміж сабой ______________ сувяззю, з дапамогай ___________________________ . Граматычныя часткі блока ўтвараюць __________________ сказ. Частка і логіка-структурны блок звязаны _________________ сувяззю, з дапамогай ______________ .

## Даведкі

1. Публіцыстычны.

2. Міжнародны дзень роднай мовы, ініцыятыве, штогод, дзяржаўнай, шматмоўя, нацыянальных, тысяч, прадстаўлены ў інтэрнэце, 2 тыдні, даследчыкі, стагоддзя, адсочвання, насельніцтва, дзясятку, носьбітаў, добраахвотна, мясціны, з'яўляецца, спадчынай, нашчадкаў, па-беларуску, грамадска-палітычнага, людское, суседскую.

3. (3) Гісторыя свята сумная: 21 лютага 1952 года ў горадзе Дака, сталіцы Бангладэш, загінулі пяць студэнтаў, якія адстойвалі права прызнаць родную для іх бенгальскую мову дзяржаўнай.

(4) Мэта свята — захаванне лінгвістычнай разнастайнасці і шматмоўя ў сучасным свеце, падтрыманне нацыянальных моў і культур, забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.

(5) Сёння на лінгвістычнай карце налічваецца каля 6 тысяч моў, але палова з іх, паводле ацэнкі ЮНЕСКА, знаходзіцца пад пагрозай знікнення, а больш за 200 лічацца мёртвымі.

(10) У дзясятку самых ужывальных па колькасці носьбітаў сёння ўваходзяць наступныя мовы: кітайская, іспанская, англійская, хіндзі, арабская, бенгальская, партугальская, руская, японская, лахнда.

(23) Не будзем забывацца на словы Францішка Багушэвіча: «Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю».

4.

| | |
|---|---|
| праз эпідэміі | [праз] |
| з іх | [з'] |
| пад пагрозай | [пат] |
| ад роднай | [ад] |
| ад сваіх | [ац] |
| між тым | [м'іш] |

5. 1) Аглушэнне звонкіх на канцы слова: *штогод, перашкод, між тым*;

2) асіміляцыя па мяккасці (прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх у сярэдзіне слова): *свеце, свята, разнастайнасці, забеспячэння, знікнення, колькасці, хіндзі, мясціны, з'яўляецца, самабытнасць, адметнасць, індывідуальнасць, развіцця, мыслення, Францішка*;

3) асіміляцыя па звонкасці (прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх у сярэдзіне слова): *носьбіт;*

4) асіміляцыя па глухасці (прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх у сярэдзіне слова): *падтрыманне, пад пагрозай, арабская, нашчадкаў, берагчы*;

5) поўная асіміляцыя (прыпадабненне аднаго зычнага да другога па ўсіх прыметах): *даследчыкі, спадчынай*.

**6.** Штогод — каждый год, лёс — судьба, нагода — повод, спадчына — наследие, каштоўнасць — ценность, люстэрка — зеркало.

**7.** 1) Нашчадкі; 2) этнас; 3) носьбіт; 4) самабытнасць; 5) мысленне.

**8.** *Глабалізацыя* — працэс сусветнай эканамічнай, палітычнай, культурнай і рэлігійнай уніфікацыі (аднолькавасці, аднастайнасці) і інтэграцыі; *міграцыя* — перамяшчэнне, перасяленне насельніцтва ўнутры краіны або за яе межамі.

**9.** *Крынічыць* — праяўляцца натуральным чынам, як прыродная патрэба.

**10.** (Не) прадстаўл-ен-ы (корань-суфікс-канчатак); рас-па-ўсюдж-ан-ых (прыстаўка-прыстаўка-корань-суфікс-канчатак).

**11.** *Між-народ-н(ы) ← народ* (прыставачна-суфіксальны спосаб);
*шмат-моў[й-э] ← шмат + мова* (асноваскладанне з суфіксацыяй);
*выпраўл-енн(е) ← выправіць* (суфіксальны спосаб);
*нось-біт ← насіць* (суфіксальны спосаб);
*раз-маўл-я(ць) ← мова* (прыставачна-суфіксальны спосаб).

**12.**

| Фразеалагізм | Прапушчаны кампанент |
|---|---|
| ... мова | агульная |
| ... мова | эзопаўская (эзопава) |
| на ... мовах | розных |
| ... мовы | дар |

**13.** Афарызм.

**14.** ЮНЕСКА (назоўнік), кожнага (займеннік), каля (прыназоўнік), паводле (прыназоўнік), тысячы (назоўнік), можа (дзеяслоў), палову (назоўнік), найбольш (прыслоўе), дзясятку (назоўнік), колькасці (назоўнік), хіндзі (назоўнік), у выніку (прыназоўнік), іншую (прыметнік), дзе (прыслоўе), адна (лічэбнік), павінны (прыметнік), як (злучнік), трэба (прэдыкатыўнае прыслоўе), проста (часціца), здольная (прыметнік), нават (часціца), але (злучнік).

**15.**

1)

| Назоўнік | Р. скл. | М. скл |
|---|---|---|
| намер | намеру | (аб) намеры |
| становішча | становішча | (аб) становішчы |
| носьбіт | носьбіта | (аб) носьбіце |
| люстэрка | люстэрка | (аб) люстэрку |
| жаданне | жадання | (аб) жаданні |

2)

| Назоўнік | Д. скл. |
|---|---|
| сталіца | сталіцы |
| ацэнка | ацэнцы |
| мэта | мэце |
| нацыя | нацыі |
| нагода | нагодзе |

**16.** Родная мова (адносны), нацыянальная мова (адносны), мёртвая мова (якасны), ужывальная мова (якасны), суседская мова (адносны).

**17.**

| Дзеяслоў | Спражэнне | Адз. лік | Мн. лік |
|---|---|---|---|
| берагчы | I | 1-я ас. бераг[у]<br>2-я ас. бераж[эш]<br>3-я ас. бераж[э] | 1-я ас. бераж[ом]<br>2-я ас. бераж[ацé]<br>3-я ас. бераг[уць] |
| паказаць | I | 1-я ас. пакаж[у]<br>2-я ас. пакаж[аш]<br>3-я ас. пакаж[а] | 1-я ас. пакаж[ам]<br>2-я ас. пакаж[аце]<br>3-я ас. пакаж[уць] |
| пазна-ваць | I | 1-я ас. пазна[ю́]<br>2-я ас. пазна[е́ш]<br>3-я ас. пазна[е́] | 1-я ас. пазна[ём]<br>2-я ас. пазна[яце]<br>3-я ас. пазна[юць] |

**18.** Адзнача-е-цца, праводз-іц-ца, ліч-ац-ца, знаходз-яц-ца, адмаўля-юц-ца, сароме-ем-ся.

**19.**

| № сказа | Займеннікі | Лексіка-граматычныя разрады займеннікаў |
|---|---|---|
| 3 | якія<br>іх | адносны<br>асабовы |
| 15 | гэты<br>усе<br>кожны<br>іх<br>якую<br>мы | указальны<br>азначальны<br>азначальны<br>асабовы<br>адносны<br>асабовы |
| 17 | сваіх<br>яе | прыналежны<br>асабовы |
| 18 | мы<br>гэтага | асабовы<br>указальны |
| 22 | сябе | зваротны |

**20.**

| Спалучэнне | Слоўны запіс | Разрад лічэбніка |
|---|---|---|
| з 2000 года | з двухтысячнага года | парадкавы |
| каля 6 тысяч моў | каля шасці тысяч моў | колькасны |
| к канцу XXI стагоддзя | да канца дваццаць першага стагоддзя | парадкавы |
| прыкладна 2/3 насельніцтва | прыкладна дзве трэція насельніцтва | колькасны дробавы |
| а 96 % моў свету карыстаюцца | а дзевяноста шасцю працэнтамі моў свету карыстаюцца | колькасны |

**21.**

| Словазлучэнне | Галоўнае слова | Залежнае слова | Від сувязі |
|---|---|---|---|
| ва ўсім свеце | *у свеце* | *усім* | *дапасаванне* |
| *гісторыя свята* | *гісторыя* | свята | кіраванне |
| *праводзіцца штогод* | праводзіцца | *штогод* | прымыканне |
| *права прызнаць* | права | *прызнаць* | *прымыканне* |
| у горадзе Дака | *у горадзе* | *Дака* | *прымыканне* |
| *захаванне разнастайнасці / захаванне шматмоўя* | захаванне | *разнастайнасці / шматмоўя* | кіраванне |
| *пяць студэнтаў* | *пяць* | студэнтаў | кіраванне |
| родную для іх | *родную* | *для іх* | *кіраванне* |
| *дваццаць першага лютага* | лютага | *дваццаць першага* | дапасаванне |

**22.** 1) Не; 2) не; 3) так; 4) так; 5) не; 6) так.

**23.**

| № сказа | Дзейнік / дзейнікі | Выказнік / выказнікі | Тып выказніка |
|---|---|---|---|
| 2 | свята | было абвешчана<br>праводзіцца | састаўны іменны<br>просты дзеяслоўны |
| 4 | захаванне<br>падтрыманне<br>забеспячэнне | мэта | састаўны іменны |
| 6 | тысячы моў | не выкарыстоўваюцца<br>не прадстаўлены | просты дзеяслоўны<br>састаўны іменны |
| 12 | вучоныя | называюць прычынай | састаўны іменны |

**24.** 1) Не; 2) так; 3) так; 4) не; 5) так.

**25.** (14) Міжнародны дзень роднай мовы — адна з нагод падумаць пра лёс роднай мовы. (18) Мы часам саромеемся гаварыць па-беларуску, называем тысячы прычын-перашкод для гэтага.

**26.**

| № сказа | Колькасць граматычных частак | Сэнсавыя адносіны |
|---|---|---|
| 5 | 3 | паміж 1 і 2 супраціўныя супрацьпастаўляльныя<br>паміж 2 і 3 супраціўныя супастаўляльныя |
| 7 | 2 | спалучальныя паслядоўнасці |
| 9 | 2 | супраціўныя супастаўляльныя |

**27.**

| № сказа | Тып даданай часткі | Сродак сувязі паміж часткамі (запішыце яго і вызначце, злучнік ці злучальнае слова) |
|---|---|---|
| 8 | азначальная | *якія* — злучальнае слова |
| 13 | азначальная з дадатковым акалічнасным значэннем месца | *дзе* — злучальнае слова |
| 16 | дапаўняльная | *як* — злучнік |
| 21 | акалічнасная ўмовы | *калі* — злучнік |

**28.** (15) У гэты дзень усе мовы прызнаюцца роўнымі, бо кожная з іх з'яўляецца ўнікальнай спадчынай, якую мы павінны захаваць для нашчадкаў.

па якой прычыне? якой?

Схема: [ x ], (бо ... спадчынай x), (якую ...).
Тып падпарадкавання: *паслядоўнае.*

**29.** 1) Так; 2) не; 3) не; 4) так; 5) так; 6) так; 7) не.

**30.** (11) Спецыялісты адзначаюць: раней мова знікала натуральным шляхам, у выніку гібелі народа (праз эпідэміі, войны), а сёння носьбіты добраахвотна пераходзяць на іншую мову.

Схема: [ ]: [ [ ], а [ ] ].

У гэтым сказе *тры* граматычныя часткі. Логіка-структурны блок утвараюць часткі *2* і *3*. Граматычныя часткі блока звязаны паміж сабой *злучнікавай* сувяззю, з дапамогай *злучальнага супраціўнага злучніка а*. Граматычныя часткі блока ўтвараюць *складаназлучаны* сказ. Частка *1* і логіка-структурны блок звязаны *бяззлучнікавай* сувяззю, з дапамогай *інтанацыі*.